СТАР. 3і 6

# СПЕЦВЫПУСК «ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!»:
## БЕЛАРУСКІЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ ЗАПРАШАЮЦЬ


**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»**

*Пачалася падпіска на II квартал 2009 года*

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10120 | 30360 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 9570 | 28710 |
| 63858 (ведамасны) | 16170 | 48510 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 14740 | 44220 |



*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 САКАВІКА 2009 г. ПЯТНІЦА

№ 47 (26405)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Грошы

## УКЛАДЫ ПЕРАВЫСІЛІ 15 ТРЫЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

**На аднаго жыхара Беларусі прыпадае 1 мільён 591,4 тысячы рублёў ва ўкладах і ашчадных сертыфікатах**

За два сёлетнія месяцы беларусы істотна папоўнілі банкаўскія дэпазіты: у студзені, нагадаем, уклады ў беларускіх банках у пераразліку на нацыянальную валюту прыраслі больш як на 1 трыльён рублёў, у лютым таксама адбыўся значны іх рост — больш як на 743 мільярды рублёў.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Журавовіч, уклады насельніцтва ўпершыню перавысілі 15 трыльёнаў рублёў, павялічыўшыся за два месяцы ў пераразліку на нацыянальную валюту амаль на 1,8 трыльёна рублёў, ці на 13,4 %. Што датычыцца ўкладаў у нацыянальнай валюце, то на пачатак сакавіка дэпазіты ў рублях склалі звыш 6,5 трыльёна. Дэпазіты ў замежнай валюце за папярэдні месяц людзі папоўнілі ў эквіваленце дзесьці на 200 мільёнаў долараў ЗША: калі на пачатак лютага яны складалі 2,8 мільярда долараў, то на пачатак сакавіка ўжо каля 3 мільярдаў.

Між іншым, як наша газета ўжо паведамляла, у гэтым месяцы адбыліся істотныя змены працэнтных ставак па валютных дэпазітах. Згодна з рэкамендацыямі галоўнага банка, камерцыйныя знізілі іх да ўзроўню канца мінулага года — у сярэднім да 12 % гадавых. А вось стаўкі па дэпазітах у нацыянальнай валюце па-ранейшаму складаюць у сярэднім каля 20 %, праўда, ёсць некалькі банкаў, якія трымаюць найвышэйшую планку ў 25 %. Паводле меркавання спецыялістаў Нацбанка, такі расклад дазволіць прастымуляваць рост укладаў насельніцтва менавіта ў рублях.

У галоўным банку краіны, дарэчы, не сумняваюцца ў тым, што і надалей насельніцтва будзе ахвотна карыстацца магчымасцю атрымліваць даход ад сваіх сродкаў на банкаўскіх дэпазітах. У прыватнасці, у Нацбанку адзначаюць, што ў параўнанні з іншымі краінамі ў Беларусі створаны найбольш выгадныя для ўкладчыкаў умовы захавання зберажэнняў у банкаўскай сістэме, асабліва з працяглымі тэрмінамі размяшчэння. Тым больш, што дэкрэтам кіраўніка нашай краіны прадугледжваецца поўная іх захаванасць ва ўсіх банках. Акрамя таго, даходы фізічных асобаў ад размяшчэння грашовых сродкаў у банкаўскіх укладах, згодна з дзейным заканадаўствам, не абкладаюцца падаткамі.

Паводле апошніх звестак, якія «Звязда» атрымала ў Нацбанку, на 1 сакавіка ў сярэднім на аднаго беларуса прыпадала 1 мільён 591 тысяча 400 рублёў зберажэнняў, размешчаных ва ўкладах і ашчадных сертыфікатах. Дарэчы, на пачатак сёлетняга года гэтая лічба раўнялася 1 мільёну 401 тысячы 600 рублям.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## $500 мільёнаў крэдыту паступілі з Расіі

**Учора на рахунак Мінфіна ў Нацыянальным банку Беларусі паступілі 500 мільёнаў долараў ЗША расійскага крэдыту, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі галоўнага банка краіны.**

Як адзначылі ў Нацбанку, гэтыя грошы будуць залічаныя ў золатавалютныя рэзервы краіны. Нагадаем, што чарговы крэдыт Расія вылучыла ў рамках дамоўленасцяў аб атрыманні ад яе нашай рэспублікай стабілізацыйнага крэдыту ў памеры 2 мільярдаў долараў у 2008-2009 гадах. Першы транш крэдыту ў памеры 1 мільярда долараў паступіў у Беларусь у сярэдзіне леташняга лістапада. Дзяржкрэдыт РФ для нашай краіны даецца тэрмінам на 15 гадоў з пяцігадовай адтэрміноўкай плацяжу па асноўным доўгу па стаўцы LIBOR плюс 3%.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Прыняты меры па недапушчэнні росту арэнднай платы ў сувязі з дэвальвацыяй рубля да еўра

**паведаміў у час online канферэнцыі на сайце БЕЛТА намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй Гаеў.**

Адносна здаваемых у арэнду вытворчых будынкаў, збудаванняў і памяшканняў, што знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, органамі дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прыняты рашэнні аб зніжэнні каэфіцыента эфектыўнасці да памеру, які дае магчымасць захаваць арэндную плату на ранейшым узроўні.

Пры здачы ў арэнду грамадскіх, адміністрацыйных і пераабсталяваных вытворчых будынкаў, збудаванняў і памяшканняў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, дзеючы парадак дае магчымасць рэгуляваць памеры арэнднай платы, у тым ліку і ва ўмовах вагання курсу валют, шляхам устанаўлення паніжаючых і павышаючых каэфіцыентаў. Іх устанаўлівае Рэспубліканская камісія па ўпарадкаванні выкарыстання адміністрацыйных будынкаў, збудаванняў, вытворчых плошчаў і іншых аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці.

Аварыя года



## У тумане сутыкнуліся больш як 30 аўто

**Легкавыя, грузавыя аўтамабілі, а таксама аўтобус з пасажырамі — усяго больш за 30 машын — учора раніцай сутыкнуліся ў Мінскім раёне на 19 кіламетры аўтадарогі Мінск — Магілёў на ўчастку дарогі каля 400 метраў.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы інспектар УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Станіслаў Салавей, ДТЗ адбылося бліжэй да васьмі гадзін раніцы. А прычынай такога маштабнага здарэння на дарозе стаў моцны туман. Дакладней, лічаць у Дзяржаўтаінспекцыі, кіроўцы былі не гатовымі да разумных дзеянняў ва ўмовах узнікнення небяспечнай сітуацыі і моцнага туману.

На месца здарэння тэрмінова выехалі некалькі брыгад хуткай дапамогі. На шчасце, у гэтым сутыкненні няма людзей, якія цяжка пацярпелі. Паводле звестак Станіслава Салаўя, 12 чалавек звярнуліся па медыцынскую дапамогу з нязначнымі цялеснымі пашкоджаннямі, у двух чалавек былі падазрэнні на пераломы і шасці пацярпелым аказана даўрачэбная дапамога на месцы.

Усім кіроўцам, у інтарэсах якіх пазбягаць паўтарэння падобных сітуацый, у Дзяржаўтаінспекцыі раяць пры выяўленні затору па ходзе руху, альбо іншай незразумелай для іх дарожнай сітуацыі, не марудзячы ўключаць аварыйную светлавую сігналізацыю, не рабіць рэзкіх манеўраў і знізіць хуткасць аж да спынення. І нагадваюць, што большасць аўтамабіляў абсталяваныя заднімі супрацьтуманнымі ліхтарамі, якія неабходна ўключаць ва ўмовах туману.

**Ігар ГРЫШЫН.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Заводская змена*

Працоўныя Мінскага завода колавых цягачоў вяртаюцца з працы. Фотаздымак зроблены ўчора каля вядомага прадпрыемства пасля завяршэння чарговай працоўнай змены.

## Хабарнікам амністыі не будзе

**Цяперашнія эканамічныя ўзрушэнні справакаваныя адсутнасцю кантролю за дзейнасцю банкаў і карупцыяй. Такую думку выказалі ўдзельнікі міжнароднай канферэнцыі «Сусветны фінансавы крызіс і яго ўплыў на эканоміку краіны», што адбылася ў Мінску.**

Як адзначыў падчас канферэнцыі Генеральны пракурор Рыгор Васілевіч, колькасць выяўленых карупцыйных злачынстваў у Беларусі працягвае паступова зніжацца: 4542 выпадкі ў 2004 годзе, 3084 выпадкі — пазалетась, 2735 — летась. Аднак сама па сабе праблема застаецца па-ранейшаму актуальнай. Дастаткова сказаць, што летась матэрыяльны ўрон ад падобных злачынстваў перавысіў 58 млрд рублёў, тады як памер кампенсацыі склаў толькі каля 12 мільярдаў.

Практыка службовых падлогаў перш-наперш адзначаецца ў сельскай гаспадарцы — гаворка ідзе аб звычайных «прыпісках». А вось што да прамысловасці, то тут вострай праблемай з'яўляюцца парушэнні заканадаўства аб дзяржаўных закупках, з-за чаго дзяржава губляе вялікія грошы. Сумным «лідарам» у гэтым выпадку стала менавіта прамысловасць — аб'ём матэрыяльнага ўрону склаў 22 млрд рублёў. Ззаду засталіся гандаль, сельская гаспадарка, будаўніцтва, ахова здароўя і адукацыя. Прычым, заўважыў Генеральны пракурор, часцяком падобныя парушэнні тлумачацца «варыятыўнасцю» заканадаўства. У выніку з'яўляецца спакуса. Разам з тым асноўным карупцыйным парушэннем застаецца хабарніцтва. Меры пакарання тут вызначаныя жорсткія — тэрмін пазбаўлення волі можа дасягаць 15 гадоў. Пры гэтым падобныя падыходы захаваюцца. У прыватнасці, паведаміў Рыгор Васілевіч, праект закона аб амністыі, які распрацоўваецца зараз, хабарнікаў датычыцца не будзе. Аднак у дачыненні да хабарнікаў трэба больш актыўна выкарыстоўваць і іншыя меры пакарання — скажам, грамадскія работы.

Адной з прэвентыўных мераў супраць хабарніцтва ў Генпракуратуры лічаць змяненне заканадаўства аб дзяржаўнай службе. Неабходна замацаваць норму, паводле якой чыноўнік будзе абавязаны паведамляць аб вядомых яму фактах карупцыі, а таксама даваць поўную інфармацыю — з якімі фінансавымі структурамі і фірмамі мае стасункі дзяржслужачы і члены яго сям'і. Плюс да таго, заўважыў Генпракурор, было б нялішнім ведаць, дзе ўладкоўваюцца чыноўнікі пасля выхаду на пенсію.

**Сяргей ГРЫБ.**

Антыкрызісная эканоміка

## ПЕРШ ЗА ЎСЁ — ЗАРПЛАТА

**Маніторынг сацыяльна-эканамічнага становішча ў рэгіёнах, што быў праведзены Федэрацыяй прафсаюзаў, засведчыў: па стане на 1 сакавіка ў краіне не адзначалася масавых скарачэнняў работнікаў. Аднак колькасць прадпрыемстваў, якія працуюць у няпоўным рэжыме, працягвала ўзрастаць.**

Паводле слоў **начальніка галоўнага ўпраўлення вытворчай і сацыяльна-эканамічнай работы ФПБ Сяргея САРОКІНА,** вымушаную няпоўную занятасць варта разглядаць як адзін са сродкаў захавання працоўных калектываў ва ўмовах сусветнага крызісу. Прычым прафсаюзы вітаюць такія падыходы. Як нагадаў Сяргей Сарокін, менавіта дзякуючы ім, і ў тым ліку ва ўрон эканамічным паказчыкам, удалося не страціць многія прадпрыемствы ў 1990-х гадах.

Адной з галоўных задач у цяперашняй сітуацыі прафсаюзы лічаць лібералізацыю айчыннай эканомікі. Праўда, зноў-такі з пэўнымі агаворкамі. Як заўважыў Сяргей Сарокін, ФПБ выступае катэгарычна супраць скасавання практыкі «браніравання» сродкаў на выплату зарплаты ў памеры 1,5 бюджэту пражытковага мінімуму на кожнага работніка на прадпрыемствах, якія сутыкнуліся з праблемамі. Пры гэтым прафсаюзы настойваюць на пераглядзе самой структуры бюджэту пражытковага мінімуму — варта нагадаць, менавіта да БПМ «прывязаныя» многія сацыяльныя выплаты.

**Сяргей ГРЫБ.**

## СТАЎКА — НА ВЫРАБ РОЗНЫХ ТАВАРАЎ

**На віцебскім прадпрыемстве «Віцязь» добрая навіна: у фірмовых крамах пакупнікам прапануецца набыць новую мадэль вадкакрысталічнага тэлепрыёмніка «Premium» дыяганаллю 26 дзюймаў (70 сантыметраў ) з сістэмай стэрэагуку. Гэты тэлевізар пры жаданні можна павесіць на сцяну.**

Як паведаміў «Звяздзе» намеснік начальніка аддзела маркетынгу і збыту Сяргей Гукаў, цяпер на прадпрыемстве робяць поўную «лінейку» тэлевізараў гэтай мадэлі. Раней ужо асвоілі выраб такіх тэлевізараў дыяганалямі 15, 20 і 32 дзюймаў. Наладзілі выраб так званых гібрыдных тэлевізараў, якія могуць прымаць аналагавы і лічбавы сігнал. Выпускаюць і спецыяльныя прыстаўкі для тэлепрыёмнікаў.

Тут акрамя галоўнай прадукцыі — каля 30 мадэляў тэлевізараў — вырабляюць пыласосы, медыцынскія прыборы для індывідуальнага карыстання.

У маі плануецца пачаць рэалізацыю фенаў. Ужо «на выхадзе» прасы ад «Віцязя». У планах нават выраб газонакасілак і іншай тэхнікі для працы на дачных участках.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У рэгіёнах таннее жыллё, найбольш істотна — дарагое

**Стабільнае патанненне жыллёвай нерухомасці ў Беларусі пачынала назірацца яшчэ мінулай восенню, Праўда, тады гэтая тэндэнцыя мела выключна кропкавы характар і закранала толькі другасны рынак жылля ў сталіцы. Сённяшняе патанненне адбываецца на фоне шумных паслянавагодніх падзей з валютай і наступстваў сусветнага фінансавага крызісу, таму мінскія жыллёвыя тэндэнцыі «пацягнулі» за сабой змяненні на рэгіянальных другасных рынках амаль імгненна. Разам з тым сёння ў абласных цэнтрах не на ўсіх сегментах жыллёвага рынку адзначаецца сапраўдны абвал цэнаў...**

### НЕВЯЛІКІЯ КВАТЭРЫ ГОМЕЛЯ ПАТАННЕЛІ ПРЫКЛАДНА НА 5 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

Гаворка ідзе менавіта пра аднапакаёвыя і двухпакаёвыя кватэры, на якія невялікі попыт у гэтым абласным цэнтры яшчэ існуе. Пачынаючы з новага года шматпакаёвымі кватэрамі і ўвогуле дарагім жыллём патэнцыяльныя пакупнікі нават не цікавяцца.

Паводле інфармацыі **спецыялістаў Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Дзяржаўнае агенцтва нерухомасці г. Гомеля»,** яшчэ 2 месяцы таму не вельмі дрэнная па якасці аднапакаёвая «хрушчоўка» каштавала каля 35 тысяч долараў. Аднак пасля таго, як кватэры пачалі даволі шпарка таннець на другасным рынку сталіцы, то і тутэйшыя гаспадары «лішніх» кватэр знізілі стартавы кошт сваіх жыллёвых квадратаў. Таму цяпер такая «хрушчоўка» ацэньваецца ў межах 30 тысяч долараў. Уласнікі невялікіх кватэр пры рэальных здзелках могуць і патаргавацца, алеканчатковыя зніжкі складаюць не больш за 1—2 тысячы долараў. Больш сучасныя аднапакаёвыя кватэры ў панэльных дзявяціпавярховых дамах патаннелі з 38 да 34 тысяч долараў. Больш прасторныя аднапакаёўкі з кухняй плошчай каля 10 квадратных метраў патаннелі з 45 да 40 тысяч долараў. На гэтыя дарагія аднапакаёўкі мінімальныя зніжкі дасягаюць 2—3 тысячы долараў. Самая вялікая прапанова прыпадае на двухпакаёвыя кватэры. «Двушкі» ў старых пяціпавярховых дамах да крызісу каштавалі 50—53 тысячы долараў, а зараз рэальна могуць набывацца не даражэй чым за 45 тысяч USD. У дзевяціпавярховых панэльных дамах двухпакаёвыя кватэры патаннелі з 57 да 52 тысяч долараў. Прасторныя двухпакаёўкі з кухняй больш за 10 «квадратаў» каштуюць ужо не 60—63, а толькі 55 тысяч долараў.

Увогуле, эксперты другаснага рынку жылля Гомеля адзначаюць, што ў горадзе склалася такая сітуацыя, калі любую кватэру рэальна прадаць толькі ў тым выпадку, калі квадратны метр жылля будзе каштаваць менш за 900 долараў. Разам з тым спецыялісты амаль упэўненыя, што сапраўды істотнага абвалу цэнаў у Гомелі не будзе. Прычына ў тым, што зараз у горадзе камерцыйнымі структурамі будуецца толькі некалькі дамоў. У гэтым выпадку грамадзяне нават з сур'ёзнымі заробкамі вымушаны набываць жыллё на другасным рынку. Таму попыт на кватэры істотна знізіўся, але ён існуе. На далейшае патанненне ў першую чаргу будуць уплываць цяжкасці з атрыманнем крэдытаў у вялікіх памерах і высокія працэнтныя стаўкі банкаў, якія зараз складаюць не менш за 26—28 %.

### ДАРАГІЯ КАТЭДЖЫ ГРОДНА ПАТАННЕЛІ АДРАЗУ НА 20—30 ТЫС. USD

У гэтым абласным цэнтры заходняга рэгіёна апошнія тры месяцы назіраецца плаўнае зніжэнне цэнаў. Працэс патанення ў першыя месяцы года крыху актывізаваўся, але... І зараз вялікая колькасць прадаўцоў трымаюць цэны на сваё жыллё на леташнім узроўні.

Разам з тым пасля старту рэзкай дэвальвацыі айчыннай валюты кватэры ў Гродне пры рэальным продажы патаннелі прыкладна на 7—9 працэнтаў. Паводле інфармацыі **кіраўніка дзяржаўнай рыэлтарскай канторы Гродна Валяр'яна СТОКІ,** сёння мінімальны кошт аднапакаёвых кватэр у старых пяціпавярховых дамах складае 30—32 тысячы долараў. Так званыя «чэшкі» і аднапакаёвыя кватэры новай планіроўкі, што летась каштавалі прыкладна 38—39 тысяч, сёння ўжо прапаноўваюцца не даражэй чым за 35 тысяч долараў. Істотна абваліўся кошт за апошнія два месяцы на двухпакаёвыя хрушчоўкі з прахаднымі пакойчыкамі, якія сёння выстаўляюцца на продаж часам за 33—38 тысяч долараў. А вось двухпакаёвыя кватэры сучаснай планіроўкі з агульнай плошчай каля 55—56 квадратных метраў патаннелі прыкладна на 3—4 тысячы долараў і каштуюць зараз каля 46 тысяч USD.

Паводле слоў суразмоўцы, сапраўды сур'ёзнае патанненне назіраецца на першасным рынку жылля, дзе сёння стала магчымым пабудаваць кватэры па лініі долевага будаўніцтва прыкладна па кошце 770 долараў за квадратны метр жылля. Тут трэба адзначыць, што ў горадзе яшчэ існуюць пабудаваныя раней дамы, дзе сёння кватэры прапаноўваюцца камерцыйнымі структурамі па кошце ад 800 да 1000 долараў за квадратны метр.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*







### ГОДОВОЙ БАЛАНС ЗАСО «ТАСК» за 2008 год

*220005, г. Минск, пр-т Независимости, 58/9. Тел. 8 (017) 225 11 24*

*тыс. руб.*

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основые средства | 6 036 016,70 | Источники собственных средств, всего | 11 990 594,40 |
| Нематериальные активы | 14 099,10 | в том числе уставный фонд | 2 407 462,00 |
| Финасовые вложения, всего в том числе | 2 153,70 | резервный фонд | |
| инвестиции в другие организации облигации и другие обязательст. | 2 153,70 | добавочный фонд | 4 158 319,20 |
| | | фонд накопления | 1 293 685,20 |
| прочие финасовые вложения | | фонд потребления | — |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 1 712 291,50 | целевое финансирование | — |
| | | Нераспределенная прибыль | 2 640 711,60 |
| Дебиторы, всего | 7 442 640,00 | Нераспределенная прибыль отчетного года | 1 490 416,40 |
| Дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 93 078,40 | Страховые резервы и фонды в том числе | 26 742 291,80 |
| | | страховые резервы | 26 108 947,80 |
| Депо премий по рискам, принятым в перестрахование | — | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 590 898,80 |
| Дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 7 349 561,60 | гарантийные фонды | 42 445,20 |
| | | Кредиторы, всего | 5 137 996,50 |
| Прочие активы | | Кредиторская задолженнось по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 540 667,20 |
| незавершенное строительство | 553 041,60 | | |
| Материальные ценности и затраты | 1 557 826,00 | Кредиторская задолженнось (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 4 597 329,30 |
| Денежные средства | 27 609 576,30 | | |
| Собственные акции, выкупленные | — | Депо премий по рискам, переданным в перестрахование | — |
| прочие активы | 1 443,80 | | |
| Непокрытые убытки прошлых лет | — | Заемные средства | — |
| Непокрытые убытки отчетного года | — | Прочие пассивы | 1 058 206,00 |
| БАЛАНС | 44 929 088,70 | БАЛАНС | 44 929 088,70 |

### ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗАСО «ТАСК» за 2008 год

*тыс. руб.*

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| **I. Страхование жизни** Страховые взносы (премии) | | |
| Страховые выплаты | | |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или-) | | |
| Расходы на ведение дела, связанные с заключением договоров страхования жизни | | |
| **Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)** | | |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование | | 60 903 783,80 |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -) | | - 6 585 116,90 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты), всего в том числе: | | 33 175 438,20 |
| доля перестраховщиков | | 1 885 685,20 |
| Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -) | | 245 690,00 |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | | |
| Отчисления в фонд (резерв) предупредительных мероприятий | | 3 348 729,00 |
| Расходы на ведение дела, связанные с заключением договоров страхования иным, чем страхование жизни | | 20 202 575,20 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | | 603 584,50 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | | 320 787,00 |
| **Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)** | | 6 097,20 |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II** | | |
| Операционные доходы | | 12 953 960,20 |
| Операционные расходы | | 10 763 519,20 |
| Внереализационные доходы | | 3 990 258,00 |
| Внереализационные расходы | | 2 466 541,20 |
| Доходы (убыток) от реализации прочих активов | | |
| Финансовый результат | | 3 720 255,00 |
| **Использовано прибыли** | | 2 229 838,60 |
| Нераспределенная прибыль (убыток) отчетного периода (+ или -) | | 1 490 416,40 |

**Общество с дополнительной ответственностью «Глобалаудит»**

УНП 190654732, 220002, г. Минск, ул. Сторожевская, 15—325, тел. (017) 2097325

Р/с 3012104420008 в ОАО «Технобанк», г. Минск, код 182

### Аудиторское заключение по бухгалтерской отчетности

**Адресат:**

Генеральному директору ЗАСО «ТАСК» Волкову Игорю Ивановичу.

**Аудируемое лицо:**

Закрытое акционерное страховое общество «ТАСК» (ЗАСО «ТАСК»);

юридический адрес: г. Минск, пр-т Независимости, 58;

сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Комитетом по надзору за страховой деятельностью при Министерстве финансов РБ от 07.09.2001 г., в ЕГР за № 100003006.

УНП 100003006.

Аудиторская организация:

Общество с дополнительной ответственностью «Глобалаудит» (ОДО «Глобалаудит»);

юридический адрес: 220002, г. Минск, ул. Сторожевская, д. 15, к. 325;

сведения о государственной регистрации: решение Мингорисполкома от 22.09.2005 г. № 1708;

УНП 190654732;

лицензия № 02200/0416620 выдана на основании решения Министерства финансов Республики Беларусь от 14.11.2005, со сроком действия до 13.11.2010.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ЗАСО «ТАСК», состоящей из:

бухгалтерского баланса на 01.01.2009;

отчета о прибылях и убытках, приложений, предусмотренных нормативными правовыми актами;

пояснительной записки.

Руководство ЗАСО «ТАСК» несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной бухгалтерской отчетности и соответствии совершенных ЗАСО «ТАСК» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями республиканских правил аудиторской деятельности.

Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации в бухгалтерской отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ЗАСО «ТАСК» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления бухгалтерской отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, бухгалтерская отчетность ЗАСО «ТАСК», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗАСО «ТАСК» на 01.01.2009 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 г., при этом совершенные ЗАСО «ТАСК» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

**Директор ОДО «Глобалаудит» Матюшонок С.А.**

**Руководитель аудиторской группы Матюшонок В.А.**

**26.02.2009 г.**

УНП 100003006


ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.03.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 880,00 |
| 1 еўра | 3 672,00 |
| 1 латвійскі лат | 5 202,78 |
| 1 літоўскі літ | 1 065,15 |
| 1 чэшская крона | 135,56 |
| 1 польскі злоты | 793,21 |
| 1 расійскі рубель | 81,60 |
| 1 украінская грыўня | 349,94 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 35,2944 |
| 10 UAH | 42,8851 |
| 1000 BYR | 12,2507 |
| EUR | 45,0674 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

# Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці: ДЛЯ ТЫХ, ХТО МАРЫЦЬ АДКРЫЦЬ СВАЮ СПРАВУ

***ІНСТЫТУТ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ***
***16 гадоў працуе на рынку адукацыйных паслуг. Гэта досыць маладая, а таму сучасная і мадэрнізаваная навучальная ўстанова, асноўная задача якой — фарміраванне прадпрымальніцкага асяроддзя ў нашай краіне. Малы і сярэдні бізнэс — вось тыя прыярытэтныя напрамкі, на якія скіравана навучанне ў гэтай ВНУ. Адкрыць сваю справу, напрыклад, аўтасэрвіс, прыдарожную кавярню ці рэстаран, гандлёвы пункт ці невялікі гатэль, аграсядзібу ці нават унітарнае прадпрыемства — менавіта сюды па адпаведныя і неабходныя веды прыходзяць маладыя людзі, мэта якіх — уласная справа. Выпускнікі, якія жадаюць працаваць у чыімсьці бізнэсе ці на дзяржпрадпрыемстве, таксама застаюцца запатрабаванымі на рынку працы.***



## Беспрацоўных з дыпломам ІПД няма

Прагматызм сённяшняй моладзі зразумелы — хочацца не проста атрымаць дыплом, а мець рэальны шанс уладкавацца на працу і валодаць ведамі, якія запатрабаваны часам. Студэнты інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці з першых курсаў праз сістэму практык завязваюць цесныя адносіны з наймальнікамі. Яны праходзяць усе стадыі — ад азнаямлення з працай пэўнага прадпрыемства да напісання дыплома па асобных аспектах яго функцыянавання. Прадпрыемствы, на якіх студэнты праходзяць практыку, самыя розныя. Ад буйных прамысловых дзяржаўнай формы ўласнасці (такіх, як, скажам, завод халадзільнікаў ці Беларускі аўтамабільны завод) і найвялікшых гандлёвых цэнтраў (ГУМ, ЦУМ, ГД «На Нямізе») да невялікіх прыватных турыстычных фірмаў. Як правіла, за пяць гадоў навучання (і практыкі адпаведна) студэнты настолькі глыбока знаёмыя з працай пэўнага прадпрыемства, што наймальнік прымае на працу ўпадабанага спецыяліста пасля таго, як той атрымлівае дыплом. Хаця, як падкрэслівае **рэктар Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці Віктар ЦЫБОЎСКІ**, заключаць працоўныя дамовы з наймальнікам студэнтам дазваляецца з трэцяга курса, чым многія і карыстаюцца. У выніку пакрыць выдаткі на навучанне некаторым удаецца яшчэ да атрымання дыплома. Такая палітыка ў галіне працаўладкавання мае свае плады — згодна з афіцыйным лістом Камітэту па занятасці, на біржы працы няма ніводнага беспрацоўнага выпускніка Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці.

Пералік спецыяльнасцяў, па якіх у інстытуце праводзіцца навучанне, актуальны на рынку працы. Гэта не дзяржзаказ прадпрыемстваў, а заказ сацыяльны і выклік часу. Сфера турызму і рэкламны бізнэс, прасоўванне тавараў ад вытворцы да пакупніка з дапамогай сучасных метадаў і тэхналогій, замежныя мовы з веданнем дзелавой перапіскі і перамоў — тыя галіны, якія з'явіліся адносна нядаўна і патрабуюць спецыялістаў, прычым як у дзяржаўных арганізацыях, так і ў прыватным сектары. Вось спецыяльнасці, па якіх праводзіць набор інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці — **«Маркетынг», «Бізнэс-адміністраванне», «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве», «Эканоміка і кіраванне турысцкай індустрыяй», «Сучасныя замежныя мовы», «Камерцыйная дзейнасць»**.

## Ва ўмовах фінансавага крызісу — за эканамічнымі ведамі

У сённяшняй сітуацыі, у прыватнасці, ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу, вялікую актуальнасць набываюць эканамічныя веды. Як зэканоміць? Што выгадна набываць зараз і якія пакупкі адкласці на потым? Па якіх законах развіваецца фінансавы крызіс, калі чакаць яго заканчэння і якія эканамічныя выгады з яго атрымаць? Што патаннее на піку крызісу і ў які момант гэта адбудзецца? Ці варта браць крэдыт і ў колькі рэальна ён абыдзецца? Спецыяліст, які валодае гэтымі ведамі, можа прымяніць іх не толькі ў сферы сваёй прафесійнай дзейнасці, але і ва ўласным жыцці, правільна сфарміраваўшы расходы свае і сваёй сям'і. Таму можна чакаць, што сёлета цікавасць да эканамічных спецыяльнасцяў у абітурыентаў вырасце. Прадпрыемствы ж у такой сітуацыі ўжо перагледзелі сваё стаўленне да такіх спецыялістаў — на рынку працы высокакваліфікаваныя эканамісты з наборам сучасных ведаў — тавар штучны, у сённяшніх рэаліях гэтыя спецыялісты не толькі не застаюцца без працы, але і самі маюць магчымасць выбраць работадаўца. У сённяшняй сітуацыі ўзрастае і роля адукацыі, таму ў часы крызісу інвестыцыі ва ўласнае навучанне (ці навучанне сваіх дзяцей) цалкам бяспройгрышныя.

Зразумела, што для таго, каб адкрыць сваю справу, трэба валодаць пэўнымі асабістымі якасцямі, быць лідарам. Не ўсе маладыя людзі могуць раскрыць свой патэнцыял у школе, дзе ён ацэньваецца адзнакамі. У вышэйшай навучальнай установе вельмі важна выпрацаваць у студэнтах іншыя крытэрыі ацэнкі ўласнай асобы — яны важныя не толькі для тых, хто мае намер адкрыць уласную справу, гэта патрабаванне сённяшняга часу, дзе многія маладыя людзі жадаюць быць самастойнымі і паспяховымі. Студэнтам у Інстытуце прадпрымальніцкай дзейнасці праз спецыяльныя псіхалагічныя трэнінгі даюць зразумець, што для таго, каб быць паспяховым ва ўласным бізнэсе, зусім неабавязкова быць выдатнікам. Тут дапамагаюць выпрацаваць намеры і магчымасці добра ўладкавацца на працу і ўдасканальваць свае веды, шмат працаваць над сабой і быць паспяховым. Хоць да якасці засваення ведаў тут падыходзяць з усёй сур'ёзнасцю. Напрыклад, для вывучэння вышэйшай матэматыкі — асновы асноў усіх эканамічных дысцыплін, у інстытуце прадпрымальніцкай дзейнасці распрацаваная свая методыка. І калі праводзяцца кантрольныя «зрэзы», на якіх «сыплюцца» студэнты ўсіх ВНУ (50-70 працэнтаў «двоек»), адзнак «нездавальняюча» тут няма. «Летась мы прайшлі атэстацыю і акрэдытацыю ўсіх спецыяльнасцяў. Кантрольныя «зрэзы» па вышэйшай матэматыцы ў нас праводзіла камісія з дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта па сваіх заданнях. І ў нас не было «двоек», — расказвае Віктар Цыбоўскі. — Хоць раней мы таксама пачыналі з «двоек». Але зараз у нас свая сістэма «пагружэння» ў вышэйшую матэматыку, такая, што любы студэнт, жадае ён таго ці не, вымушаны вывучыць прадмет».



*Пасяджэнне студсавета.*

## Дапамога выпускнікам — падтрымка прадпрымальніцтва

Падтрымка выпускнікоў Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці не абмяжоўваецца працаўладкаваннем. Нядаўна па ініцыятыве Міністэрства эканомікі і мінскага гарадскога камітэта па прадпрымальніцтве ВНУ была абрана базай для стварэння Цэнтра падтрымкі прадпрымальніцтва. Пакуль у рэспубліцы гэта адзіны такі цэнтр пры вышэйшай навучальнай установе. Нядаўні выпускнік інстытута, у якога з'яўляюцца пытанні па ўласным бізнэсе, або любы прадпрымальнік, якому патрэбна прафесійная дзелавая кансультацыя, можа атрымаць яе ў спецыялістаў. Як напісаць бізнэс-план ці юрыдычна правільнаператварыцца з фізічнай асобы ў юрыдычную, як наладзіць турыстычны бізнэс у аграсядзібе — такія праблемы знаёмыя многім маладым прадпрымальнікам. Да кансультацый прыцягваюцца не толькі выкладчыкі кафедраў інстытута, але і любыя спецыялісты, якія валодаюць карысным і актуальнай інфармацыяй — юрыдычнай, эканамічнай, статыстычнай і інш. Прадпрымальнік-пачатковец можа атрымаць усё аж да пакета неабходных дакументаў. Любы выпускнік у цэнтры можа пракансультавацца, дзе яму лепш распачаць уласны бізнэс. Напрыклад, рабіць турыстычны бізнэс сёння ў сталіцы няма неабходнасці — гэты рынак цалкам заняты, і пачынаць працаваць можна толькі з такой якасцю, якая дасць магчымасць выціснуць з гэтага рынку кагосьці з канкурэнтаў. А вось атрымаць інфармацыю, у якіх рэгіёнах турыстычных фірмаў не хапае, у цэнтры якраз і можна.

Праз Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва арганізоўваецца і карпаратыўнае навучанне. Гэта актуальна для тых фірмаў, якія пашыраюцца, і новаму персаналу патрабуецца навучанне. Праз семінары, курсы, сустрэчы са спецыялістамі слухачы атрымліваюць сучасныя веды. Зараз, напрыклад, арганізавана навучанне гідаў-перакладчыкаў, якія будуць суправаджаць пры выездзе за мяжу прадстаўнікоў дзелавых колаў нашай краіны.

У перспектыве ў цэнтры будзе створана асацыяцыя выпускнікоў, якія самі вядуць бізнэс, яны таксама будуць дзяліцца вопытам. «Галоўная наша задача — падтрымаць сваіх выпускнікоў, — гаворыць Віктар Цыбоўскі. — Гэта сусветная практыка. Усе вядомыя ВНУ ў Еўропе маюць такія цэнтры ўзаемадзеяння са сваімі выпускнікамі. Асабіста для мяне важна, каб праз шмат гадоў яны сказалі, што інстытут адыграў у іх жыцці сваю вялікую ролю».

Рэктар Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці Віктар Цыбоўскі падкрэслівае, што ВНУ, якую ён узначальвае, — народная навучальная ўстанова, тут заўсёды рады бачыць амбіцыйных маладых людзей, якія імкнуцца да большага, жадаюць змяніць свой сацыяльны статус. «Адукацыя — гэта той прадукт, які звязаны з асабістымі намаганнямі чалавека. І мы рады бачыць у нашай навучальнай установе актыўных маладых людзей, якія здатныя да ўдасканалення сябе, з якіх у будучыні вырасце пакаленне тых, хто будзе мадэрнізаваць нашу эканоміку».

**Алена КРАВЕЦ,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота з архіва ІПД.**

**НАШ АДРАС**
**220033, г. Мінск,**
**вул. Серафімовіча, 11**
**Тэл.: 8 (017) 247 06 22,**
**8 (017) 247 08 77.**
УНН 101357946.



*Круглы стол па тэме «Выберы сваю будучыню».*

**Дні адкрытых дзён у Інстытуце прадпрымальніцкай дзейнасці пройдуць**
**21 сакавіка, 18 красавіка, 16 мая.**



*Старшы выкладчык кафедры гуманітарных дысцыплін Таццяна ТРАПЕЗНІКАВА са студэнтамі 5-га курса.*


**БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИНФОРМАТИКИ И РАДИОЭЛЕКТРОНИКИ**

**ПРОВОДИТ В 2009 ГОДУ ДНИ ОТКРЫТЫХ ДВЕРЕЙ**

***Март—апрель***

*В университете*
**31 марта, вт., 14.00, актовый зал, корпус 2, ул. П. Бровки, 4**

*на факультете компьютерного проектирования*
**31 марта, вт., ауд. 202-3, 15.00—17.00, ул. П. Бровки, 10**

*на факультете информационных технологий и управления*
**1 апреля, ср., 514-5, 15-00—17.00, ул. Платонова, 39**

*на инженерно-экономическом факультете*
**1 апреля, ср., 108-4, 15.00—17.00, ул. Гикало, 9**

*на факультете компьютерных систем и сетей*
**2 апреля, чт., 209-4, 15.00—17.00 ул. Гикало, 9**

*на факультете радиотехники и электроники*
**2 апреля, чт., 202-3, 15.00—17.00, ул. П. Бровки, 10**

*на факультете телекоммуникаций и на военном факультете*
**3 апреля, пт., 206-3, 15.00—17.00, ул. П. Бровки, 10**

*в институте информационных технологий*
**3 апреля, пт., 15.00, ауд. 803, корпус 7, ул. Козлова, 28**

*на факультете заочного, вечернего и дистанционного обучения*
**4 апреля, сб., 209-3, 11.40, ул. П. Бровки, 10**

**В ПРОГРАММЕ:** встречи с представителями ректората, деканами, зав. кафедрами, ответственным секретарем приемной комиссии, знакомство со специальностями, по которым осуществляется обучение, с условиями поступления, с особенностями подготовки к вступительным испытаниям.

УНП 100363945

**Консультации о порядке поступления и обучения на заочном отделении ВУЗов с государственной аккредитацией по специальностям:**

- **юриспруденция;**
- **финансы и кредит.**

- **Обеспечение** всех студентов-заочников **общежитием**;
- Сроки подготовки специалистов в соответствии с учебными планами и госстандартами:
**3,5 года** на базе **среднего специального профильного (техникум) и высшего** образования;
**6 лет** на базе среднего образования;
- Выпускникам ВУЗов вручаются **ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ДИПЛОМЫ**, которые имеют полную юридическую силу в РБ и признаются в других европейских государствах.
- Доступная стоимость обучения.

За более подробной информацией обращайтесь
**в «МНЮИ КОНСУЛЬТАНТ»:**
**220004, г. Минск, ул. Коллекторная, д. 20 «А», тел.**



**(017) 200 82 57, 200 63 51**
**GSM (029) 509 82 57, (044) 709 82 57**
**www.mnji.by**
УНП 190593633
*Свидетельство о государственной регистрации № 190593633 от 13.01.2005 г. Мингорисполкома.*



**УВАЖАЕМЫЕ ВЫПУСКНИКИ ШКОЛ, СРЕДНИХ СПЕЦИАЛЬНЫХ УЧЕБНЫХ ЗАВЕДЕНИЙ!**

Чтобы не ошибиться в выборе профессии, правильно определить жизненный путь, приглашаем всех на **День открытых дверей** в **Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина**. Ждем Вас и Ваших родителей **28 марта 2009 года в 11.00 в 317 аудитории.**

**Адрес:** 224665, г. Брест, бульвар Космонавтов, 21, приемная комиссия.

**Телефоны:** +375 162 23 04 17 (до 30.06.2009 г.), +375 162 23 00 64 (с 01.07.2009 г.) — приемная комиссия.

**Факс:** +375 162 23 09 96.

**Web-сайт**: http://www.brsu.brest.by (официальный сайт вуза)
**E-mail:** selcom@ brsu.brest.by (приемная комиссия)

**ГРАФИК регистрации граждан для участия в профессионально-психологическом собеседовании в БрГУ имени А.С. Пушкина**

для поступающих на специальности:

**«Государственное управление»;**
**«Государственное управление и право»;**
**«Государственное управление и экономика»;**
**«Правоведение», «Экономическое право»**

| Дата | Время | Аудитория |
|---|---|---|
| 05.03.09—06.03.09 | с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 | 411 |
| 09.03.09—13.03.09 | | |
| 16.03.09—20.03.09 | | |
| 23.03.09—27.03.09 | | |
| 30.03.09—31.03.09 | | |
| 28.03.09—29.03.09 (суббота, воскресенье) | с 9.00 до 15.00 | 411 |

**ГРАФИК проведения профессионально-психологического собеседования в БрГУ имени А.С. Пушкина**

для поступающих на специальности:

**«Государственное управление»;**
**«Государственное управление и право»;**
**«Государственное управление и экономика»;**
**«Правоведение», «Экономическое право»**

| Дата | Время |
|---|---|
| 05.04.09 | с 9.00 |
| 11.04.09 | |
| 18.04.09 | |
| 25.04.09 | |
| 30.04.09 (резервный день) | |

УНН 200050321.


## Кошт платнага навучання ў беларускіх ВНУ адпавядае затратам

**Аб гэтым паведаміў журналістам міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў, передае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Безумоўна, усё залежыць ад спецыяльнасці. Напрыклад, пры падрыхтоўцы медыкаў або інжынераў выкарыстоўваецца дарагое абсталяванне, што павышае затраты на падрыхтоўку спецыялістаў», — дадаў міністр. Рэнтабельнасць навучання ў ВНУ краіны складае 5 працэнтаў. Пры гэтым Аляксандр Радзькоў дадаў, што на асобных факультэтах кошт навучання можа дасягаць $2 тыс., аднак студэнт плаціць каля $1,2 тыс. У гэтым навучальным годзе колькасць бюджэтных месцаў павялічана на 1500. Нягледзячы на гэта, высокія конкурсы захаваюцца як на бюджэтныя, так і на платныя месцы, сказаў міністр. Папулярнасцю ў абітурыентаў карыстаецца і сярэдняя спецыяльная адукацыя. «Высакакласныя рабочыя часам зарабляюць больш, чым інжынеры з вышэйшай адукацыяй, — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў. — Галоўнае, чаго мы павінны дабіцца, гэта дапамагчы чалавеку вызначыцца з тым, кім ён хоча быць у будучым, якую сацыяльную ролю будзе выконваць у грамадстве».

## Дні Франкафоніі праходзяць 10-20 сакавіка ў Мінску

**Аматараў французскіх кіно, літаратуры, музыкі, тэатра чакае нямала прыемных сюрпрызаў, аб якіх карэспандэнту БЕЛТА расказаў саветнік па супрацоўніцтве і культуры Пасольства Францыі ў Беларусі Людавік Руае.**

Дні Франкафоніі стартуюць Тыднем французскага кіно і франкафоннай паэзіі. У кінатэатры «Цэнтральны» з 10 па 15 сакавіка арганізавана дэманстрацыя 5 фільмаў на французскай мове з субтытрамі на рускай: «Няправільная вера» (2006) рэжысёра Рашдзі Зем, «Дзед Мароз — адмарозак» (1982) рэжысёра Жан-Мары Пуарэ, «Ты і я» (2006) рэжысёра Жулі Лопеса Курваля, «Францыя» (2007) рэжысёра Сержа Базона, «Гільяціна» (2005) рэжысёра Коста-Гаўраса. Асабліваць гэтага паказу ў тым, што фільмы будуць дэманстравацца двойчы ў час Тыдня французскага кіно. У гэтыя ж дні аматары франкафоннай паэзіі змогуць наведаць розныя мерапрыемствы, аб'яднаныя тэматыкай «смех і гумар». У праграме — тэатралізаваныя чытанні гумарыстычных паэм, літаратурнае кафэ, прысвечанае Ле Клезіё (Нобелеўская прэмія 2008 года), прэзентацыя творчасці французскага пісьменніка Жана Тардзьё.

З 16 па 20 сакавіка Пасольства Францыі правядзе Тыдзень французскай мовы. Тыдзень завершыцца ў МДЛУ традыцыйным гала-канцэртам франкафоніі, на якім прагучаць французскія песні і будуць выконвацца французскія танцы.

Як падкрэслілі ў пасольстве, французская мова прызнана афіцыйнай у 29 дзяржавах, якія ўваходзяць у Міжнародную арганізацыю франкафоніі. Яна налічвае 70 членаў, з якіх 56 — дзяржавы і ўрады (Кіпр і Гана выступаюць на асацыяцыйных правах) і 14 — краіны-наглядальнікі.

У 2006 годзе колькасць франкафонаў ва ўсім свеце перасягнула рубеж 200 млн, а колькасць тых, хто вывучае французскую мову, дасягнула 118 млн.


Учреждение образования
**«БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ ИСКУССТВ»**

**ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ АБИТУРИЕНТОВ**
**в 2009 году по следующим специальностям:**

**ДНЕВНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ**
**(на бюджетной и платной основе)**

**ТЕАТРАЛЬНЫЙ ФАКУЛЬТЕТ**

*Специальности* — актерское искусство (драматический театр и кино, музыкальный театр), режиссура кино и телевидения (телевидение, документальный фильм), режиссура театра (драматический театр), кинотелеоператорство (телеоператорство), искусствоведение (организация театральной деятельности).

**ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ ФАКУЛЬТЕТ**

*Специальности* — живопись (станковая), монументально-декоративное искусство (роспись), скульптура, графика.

**ФАКУЛЬТЕТ ДИЗАЙНА И ДЕКОРАТИВНО-ПРИКЛАДНОГО ИСКУССТВА**

*Специальности* — дизайн объемный, дизайн мебели, экспозиционный дизайн, дизайн интерьеров, дизайн (графический), фотографика, телереклама, дизайн виртуальной среды, декоративно-прикладное искусство (изделия из керамики, изделия из текстиля, костюм, изделия из металла).

**ЗАОЧНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ**
**(на бюджетной и платной основе)**

**ТЕАТРАЛЬНЫЙ ФАКУЛЬТЕТ**

*Специальности* — актерское искусство (драматический театр и кино), режиссура театра (драматический театр), режиссура кино и телевидения (телевидение, звукорежиссура), кинотелеоператорство (телеоператорство).

Прием заявлений на очную и заочную форму обучения осуществляется в сроки, определенные Правилами приема в высшие учебные заведения в 2009 году.

Поступающие в Академию представляют сертификаты о результатах централизованного тестирования по белорусскому или русскому языку и истории Беларуси, сдают экзамены по дисциплине «Творчество».

В Академии действуют подготовительные курсы по рисунку, живописи, композиции, актерскому мастерству, режиссуре.

Консультации для абитуриентов проводятся:
- на театральном факультете — по вторникам с 17.00 до 19.00 и воскресеньям с 12.00 до 14.00 в аудиториях;
- на художественном факультете и факультете дизайна и декоративно-прикладного искусства — на кафедрах ежедневно, кроме субботы и воскресенья.

**АДРЕС АКАДЕМИИ:** 200012, г. Минск, пр. Независимости, 81.
**СПРАВКИ ПО ТЕЛЕФОНАМ:** 292 12 21 — театральный факультет, 331 34 78 — художественный факультет, 292 51 53 — факультет дизайна и декоративно-прикладного искусства.

УНН 100289132.












## ПУЦЯВЫЯ РАБОТЫ ПРАЦЯГВАЮЦЦА...

У сувязі з іх правядзеннем 18, 19 і 20 сакавіка электрацягнік Мінск—Маладзечна адпраўленнем на 12.40 будзе ісці да станцыі Аляхновічы, а электрацягнік Маладзечна—Мінск адпраўленнем на 13.50 на ўчастку Маладзечна—Аляхновічы будзе ўвогуле адменены.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

